**СПИСОК ЛИТЕРАТУРЫ**

1. Спаечная болезнь брюшной полости: состояние проблемы и современные методы профилактики / В. А. Самарцев, В. А. Гаврилов, Б. С. Пушкарев [и др.] // Пермский медицинский журнал. – 2019. – Т. 36, № 3. – С. 72-90.

2. Филенко, Б. П. Лечение и профилактикаострой спаечной кишечной непроходимости / Б. П. Филенко, В. П. Земляной, П. А. Котков // Вестник Северо-Западного государственного медицинского университета им. И.И. Мечникова. – 2017. – Т. 9, № 1. – С. 68-72.


# ПРАБЛЕМЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПСІХІЯТРЫЧНАЙ ДАПАМОГІ Ў ГОРАДЗЕ ГРОДНА Ў 1920-Я ГАДЫ


**Чарнякевіч І. С.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт


**Актуальность.** Вывучэнне гісторыі станаўлення сістэмы аховы здароўя, аналіз праблем, з якімі сутыкаліся ўрачы і медыцынскія чыноўнікі ў папярэднія часы, дазваляе ацаніць вытокі некаторых праблем сучаснай медыцыны.

**Цель** – на падставе аналізу даступных крыніц разгледзець праблемы арганізацыі дапамогі псіхічна хворым у горадзе Гродна ў 20-я гады XX стагоддзя.

**Методы исследования.** Аналіз архіўных дакументаў і літаратуры.

**Результаты и их обсуждение.** Большасць пытанняў арганізацыі аховы здароўя ў II Рэчы Паспалітай былі ў кампетэнцыі органаў самакіравання. Адной з балесных праблем у Гродна ў 1920-я гады была справа аказання дапамогі псіхічна хворым. Патрэбна адзначыць, што Гродзенскі псіхіятрычны шпіталь упамінаецца ў справаздачы Гродзенскай урачэбнай управы ўжо ў 1914 годзе. Лёсы гэтага шпіталя падчас Першай сусветнай вайны прасачыць даволі цяжка. Аднак, у міжваенным Гродна ў 1920-я гады такі шпіталь існаваў, аб чым сведчаць архіўныя дакументы. Так, у адным з пратаколаў паседжання Гарадской Рады за 1927 год мы чытаем, што Гардская Рада Гродна адмовілася ўдзельнічаць у пабудове міжкамунальнага шпіталя для псіхічна хворых з Усходніх ваяводстваў Рэчы Паспалітай, спаслаўшыся на тое, што не бачыць мэтазгоднасці ў дадзеным праекце ў сувязі з вялікімі выдаткамі, якія і так нясе горад, утрымліваючы за гарадскі кошт уласны псіхіятрычны шпіталь. Замест удзелу ў дарагім будаўніцтве было прапанавана выкарыстаць плошчы былога акружнага шпіталя ў Гродна, які знаходзіўся ва уладанні Міністэрства вайсковых спраў [1, арк. 35 зв].

Репозиторий ГрГМУ

Аднак, справы ў шпіталі ішлі не надта добра. Гаворка перш за ўсё пра матэрыяльную базу. Аднак, адзначалася і нядбайнае стаўленне персаналу да сваіх абавязкаў. Так, падчас выступлення на паседжанні Гарадской Рады 28 жніўня 1928 г. сябры пастаяннай санітарнай камісіі Гарадской Рады спадары Антоній Валанскі і Марк Хвілявіцкі, характарызуючы стан гарадскіх інстытутаў аховы здароўя, азначылі, што ў найгоршым стане знаходзіўся псіхіятрычны шпіталь на Тэатральнай плошчы. “Ужо каля ўвахода, – чытаем мы ў пратаколе, – прычым летам, пры адкрытых вокнах, у нос б’е гэткі смурод, быццам бы ў самай кепскай прыбіральні. І гэты смурод сыходзіць не ад нядбайна дагледжанных хворых, а ад мясцовай прыбіральні, што знаходзіцца наўпрост у калідоры і ўтрымліваецца ў зусім немагчымым стане. Калі мы ўвайшлі, дзверы да гэтай прыбіральні з боку калідора былі прывязаны да клямкі дротам. Сястра патлумачыла нам, што ў прыбіральні зачынена адна з “неспакойных” хворых і што падобнае ўціхамірванне хворых шляхам зачынення іх на нейкія поўгадзіны практыкуецца тут даволі часта. Аднак, калі мы ўсё ж такі адчынілі дзверы, дык высветлілася, што хворая, вельмі лёгка апранутая, насамрэч не праяўляла ніякага “непакою”, а займалася мыццём падлогі. У адным з адасобленых пакояў (ізалятар) мы пабачылі зусім нагую жанчыну, якая сядзела ўпрост на каменным падлозе ў лужыне з, верагодна, уласных выдзяленняў” [2, арк. 161-164]. Далей члены камісіі адзначаюць агульную занядбаласць памяшканняў: паўсюль да немагчымасці знішчаныя сцены з адбітай тынкоўкай, мала святла, дзверы забітыя непагабляванымі дошкамі – усе гэта стварае вельмі цяжкае ўражанне. “Іншых хворых, – чытаем далей, – мы пабачалі ў садзе, дзе яны гулялі ў парванай бялізне, якая хутчэй нагадвала лахманы, без аніякай верхняй вопраткі. У нас не хапае словаў, каб апісаць тыя ўражанні, якія мы атрымалі пасля наведвання гэтага шпіталя. Нельга з ім параўнаць ніводную вязніцу. Ніякіх сучасных метадаў лячэння ў шпіталі няма і быць ня можа, як няма гідратэрапіі альбо нейкіх рамёстваў ці наогул заняткаў для хворых. Калі горад не абавязаны ўтрымліваць псіхіятрычны шпіталь, дык трэба яго зачыніць, размясціўшы хворых па іншых спецыяльных установах, а не ствараць месца для правядзення катаванняў над людзьмі, якіх тут трымаюць горш за хатніх жывёлаў...” [2, арк. 161-164].

Патрэбна адзначыць, што гэтыя матэрыялы ў хукім часе патрапілі на старонкі мясцовых газет пад загалоўкамі пра сучасных “інквізітараў” ад медыцыны. У адказ супрацоўнікі мясцовых шпіталяў выступілі з адкрытым зваротам да Гарадской Рады, ў якім раскрытыкавалі характар дзеяння сяброў санітарнай камісіі радных Валанскага і Хвілявіцкага за тое, што яны “вельмі дакладным чынам зняславілі гарадскую сістэму шпіталяў, нават не выслухаўшы ўрачоў, якія там працуюць” [2, арк. 181-181 зв]. Пад зваротам падпісаліся супрацоўнікі гродзенскіх шпіталяў Юзаф Слешынскі, Міхал Ленартовіч, Самуэль Хазан, Эдвард Мараўскі, Абрам Ліпнік і Аляксандр Тальгейм, якія запатрабавалі стварыць дзве камісіі: следчую, якая б праверыла прыведзеныя ў артыкулах факты і прафесійную – з мэтаю высветліць рэальны стан гарадскіх шпіталяў [2, арк. 181-181 зв]. Акрамя таго, Аляксандр Тальгейм выступіў з асобным мемарыялам, у якім адзначыў недастаткова глыбокі аналіз сітуацыі са



Рэпазіторый ГрДМУ

шпіталямі, выкладзены ў справаздачы санітарнай камісіі. Сярод іншага, ён прывёў прыклады бюджэтных асігнаванняў, якія былі абрэзаны гарадскімі ўладамі цягам апошніх некалькіх гадоў, у тым ліку і на рамонт будынкаў. "...Працую, як умею, – дадаў ён. – Разам з маімі калегамі – робім тое, што мы ўмеем і што ў нашай моцы..." [арк, л. 181 зв]. Яго ў асобнай прамове падтрымаў ардынатар псіхіатрычнага і венералігчнага шпіталяў доктар Абрам Ліпнік.

З крытыкай санітарнай камісіі выступіў таксама прадстаўнік сацыялістычнай фракцыі Гарадской Рады доктар і чыноўнік ад медыцыны Ян Падвінскі, што толькі абвастрыла агульную дыскусію, якая амаль не скончылася самароспускам санітарнай камісіі. Толькі заява Падвінскага, што галоўная віна за дыскрэдытацыю гарадскіх службаў аховы здароўя ляжыць на рэдакцыі газеты "Głos prawdy", якія змясціла, акрамя справаздачы санітарнай камісіі яшчэ і іншыя, неправераныя факты, дала магчымасць скончыць паседжанне [2, арк. 180 – 184 зв].

У выніку, на паседжанні Гарадской Рады 9 кастрычніка 1928 г. была створана спецыяльная камісія ў складзе радных Абрама Любіча, Яна Падвінскага і Чэслава Есьмана для высвятлення стану гарадскіх шпіталяў [2, арк. 180 – 184 зв].

Аднак, ужо у канцы 1928 г. Гродна далучылася да камунальнага саюза будоўлі псіхіатрычнага шпіталя ў Хорашчы каля Беластока [2, арк. 216 – 216 зв], які быў адчынены ў 1930 годзе [3, с. 140]. У гэтым жа годзе гродзенскі псіхіятрычны шпіталь быў ліквідаваны.

**Выводы.** Такім чынам, на працягу 1920-х гадоў праблема арганізацыі псіхіятрычнай дапамогі ў Гродна заставалася вельмі вострай і балеснай.

## СПИСОК ЛИТЕРАТУРЫ

1. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 17. Воп. 1. Спр. 3
2. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 4
3. Grassmann, M. Szpitalnictwo cywilne w województwie białostockim w II Rzeczypospolitej / M. Grassmann, A. Zemke-Górecka, B. Kędra // Miscellanea Historico-Iuridica. – T. VIII. – URL: https://repozytorium.uwb.edu.pl/jspui/bitstream/11320/1567/1/Miscellanea_T-8_8.pdf (дата звароту: 18.12.2025).

Репозиторий ГрГМУ